**Бондарава, Т.** «Лётчыкі не гінуць. Яны проста вылятаюць і не вяртаюцца» / Т. Бондарава // Настаўніцкая газета. — 2019. — 23 лют. — С. 13.

## «ЛЁТЧЫКІ НЕ ГІНУЦЬ. ЯНЫ ПРОСТА ВЫЛЯТАЮЦЬ І НЕ ВЯРТАЮЦЦА»

*Мемарыяльныя дошкі ў памяць пра загінуўшых воінаў-афганцаў з'явіліся ў трох установах агульнай сярэдняй адукацыі Віцебскай вобласці, дзе раней вучыліся героі.*

У душах, сэрцах і лёсах тысяч дарослых і юных жыхароў паўночнага рэгіёна жывы напамін пра афганскую вайну. Менавіта з Віцебшчыны ў поўным складзе была адпраўлена выконваць інтэрнацыянальны абавязак легендарная 103-я паветрана-дэсантная дывізія: яны першымі ўвайшлі ў Афганістан і яны ж замыкалі калону пры вывадзе савецкіх войск з далёкай усходняй краіны. У абласным цэнтры побач з мемарыяльным комплексам у памяць пра загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў «Боль», у пабудаваным калісьці спецыяльна для афганцаў і іх сем'яў доме, на вуліцы, названай у гонар воінаў-інтэрнацыяналістаў, размешчаны аднайменны музей – дарэчы, першы па часе адкрыцця на постсавецкай прасторы.

Памяць пра сваіх землякоў і выпускнікоў свята захоўваецца ва ўстановах адукацыі Віцебшчыны. Штогод да 15 лютага ў школьных музеях адкрываюцца тэматычныя выставы, праводзяцца экскурсіі, сустрэчы з воінамі-афганцамі і іх роднымі, урокі мужнасці, мітынгі, на якіх людзі ўспамінаюць загінуўшых і аддаюць даніну павагі жывым удзельнікам той вайны. Сёлета ў гонар герояў, лётчыкаў-афганцаў Сцяпана Млявага, Сяргея Спелага і Сяргея Кароткіна ў іх родных школах адкрыліся мемарыяльныя дошкі. У Чашніцкай гімназіі (раней – сярэдняя школа № 2) ушанавалі памяць свайго выпускніка – **капітана штурмана першага класа Сцяпана Млявага**, які са снежня 1984-га здзейсніў каля 120 вылетаў «за рэчкай». Сцяпан Пятровіч загінуў у Афганістане 14 сакавіка 1985 года і пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і афганскім ордэнам Чырвонага Сцяга.

«Лётчыкі не гінуць, яны проста вылятаюць і не вяртаюцца» – неяк занатаваў былы выпускнік сярэдняй школы № 30 Віцебска, а на той момант ужо камандзір экіпажа верталёта Мі-24 **капітан Сяргей Спелаў**. У кастрычніку 1982-га, вяртаючыся з паспяхова выкананага баявога задання, яго верталёт быў збіты над гарой Катасанг. Сяргей Спелаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. На рахунку выпускніка сярэдняй школы № 4 Віцебска, **лейтэнанта Сяргея Кароткіна** – каля 100 баявых вылетаў. Гераічны летапіс яго жыцця абарваўся 20 сакавіка 1985 года: у раёне населенага пункта Рабат верталёт збілі душманы. За мужнасць і гераізм віцяблянін пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу» і «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», яму прысвоена званне старшага лейтэнанта.

– Мы помнім і шануем подзвігі і мужнасць, праяўленыя нашымі землякамі ў Афганістане. – падкрэсліў падчас адкрыцця мемарыяльнай дошкі намеснік старшыні гарвыканкама Віктар Глушын. – У горадзе восем вуліц названы іх імёнамі. з'явіліся помнікі і мемарыяльныя дошкі, створаны музеі і комплексы. Вернасць ветэранаў-інтэрнацыяналістаў прысязе і Радзіме павінна быць прыкладам для маладых людзей, якія, як і папярэднія пакаленні вайскоўцаў, гатовы стаць на абарону Айчыны.

**Таццяна БОНДАРАВА**